
MARK MILLAR · JOHN ROMITA JR.
KICK ASS 3™
$2.99
ISSUE 1
.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
Мардабой 3
№1 (2013)
пераклад
і афармленне:
Козыраў Сяргей
JR JR
TP
DW
EVIL PREV

KICK-ASS 3

ISSUE ONE

MARK MILLAR
WRITER AND COCREATOR

JOHN ROMITA JR.
PENCILS AND COCREATOR

TOM PALMER
INKS AND WASHES

DEAN WHITE
COLORS

CHRIS ELIOPOULOS
LETTERS

JENNIFER LEE
EDITOR

ADAM HUGHES
HIT-GIRL COVER

PASQUAL FERRY
DR. GRAVITY & INSECT-MAN COVER

MARC SILVESTRI & SUNNY GHO (colors)
COLONEL STARS COVER

CULLY HAMNER
BATTLE-GUY & NIGHT-BITCH COVER

ADAM KUBERT & FRANK MARTIN JR. (colors)
EISENHOWER THE DOG COVER

PREVIOUSLY:

Дэйв Лізеўскі заўсёды хацеў быць супергероем. Цяпер ён адзін з іх. А яго майстар Забівашка знаходзіцца ў турме.

IDETTE WINECOOR: PRODUCTION

DAVID BOGART: SVP OF OPERATIONS & PROCUREMENT, PUBLISHING

KICK-ASS 3 No. 1, July 2013. Published Monthly by MARVEL WORLDWIDE, INC., a subsidiary of MARVEL ENTERTAINMENT, LLC. OFFICE OF PUBLICATION: 135 West 50th Street, New York, NY 10020.


Дарагі Мардабой. Калі ты чытаеш гэта, значыць лайно ўсё ж патрапіла ў вентылятар, і мяне або забілі, або пасадзілі.
З іншага боку, цяпер ты - адзіны ўладальнік усіх клёвых штук, што ў мяне былі.
Калі мяне ўсё ж арыштавалі і пасадзілі (бо наша судзебная сістэма жаласна і ліберальна), я заставіла некалькі інструкцый, як мне дапамагчы УЦЯКЧЫ.
Я заставіла табе два міліёна даляраў наяўнымі і ўсё сваё УЗБРАЕННЕ, ТРАНСПАРТ і АБМУНДЗІРАВАННЕ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ СА ЗЛАЧЫННАСЦЮ...
...і падрабязныя схемы любога добра ахоўванага будынку, дзе ўлады могуць мяне ТРЫМАЦЬ.
Мой бацька заўсёды вучыў мяне ДУМАЦЬ НАПЕРАД, і я абнаўляла гэтую інфармацыю рэгулярна.
Канешне ж я разумею, што саўдзел ва ўцёках з турмы ВЯЛІКАЯ ПРОСЬБА, асабліва для супергероя, які яшчэ толькі спрабуе зрабіць сабе ІМЯ...
...але ЧОРТ БЯРЫ. Няўжо я калі-небудзь ЗАБІВАЛА кагосьці, хто таго не ЗАСЛУГОЎВАЎ?
Яны, напэўна, ПАЦЯШАЮЦЦА. Садзіць мяне, калі на волі столькі САПРАЎДНЫХ ляснутых сацыяпатаў, якія катуюць нявінных людзей.


Я хачу, каб ты на пару тыдняў ПАСЯДЗЕЎ ЦІШЭЙ ВАДЫ і азнаёміў сваю каманду з АСОБНЫМІ СПРАВАМІ, ГРАФІКАМ ЗМЕНЫ ВАРТАВЫХ і РАЗМЯШЧЭННЕМ КАМЕР, якія я назбірала.
Гэта будзе непроста, але калі вы будзеце рупліва ТРЭНІРАВАЦЦА і СТАРАННА ПАДРЫХТУЕЦЕСЯ, тады я не бачу ніякіх прычын, якія б маглі перашкодзіць вам вызваліць мяне і У ХУТКІМ ЧАСЕ зноў патруліраваць вуліцы.
Я ведаю, гучыць жорстка, але мы СПЕЦЫЯЛІЗУЕМСЯ на немагчымым, таму я нікому больш не магу давяраць сваё выратаванне.
P.S. Калі змарнуеш хоць адзін цэнт з маіх грошаў на КОМІКСЫ, я твае ЯЙЦЫ на сцяну павешу.
Дэйв, гэта **шаленства**. Мы не зможам проста ўзяць і вызваліць Забівашку з добра ахоўванах **турмы**. Гэта самая тупая ідэя з тых, што я **чуў**.
Мы **павінны**, Марці. Яна **тысячу разоў** выратоўвала мой азадак. Я не магу адмовіць ёй тады, калі ёй, як ніколі яшчэ ў жыцці, спатрэбілася **дапамога**.
Але мы ж **лайнасмакі**, чувак. **Немагчыма** такое ўчыніць у рэальным жыцці! З чаго нам **пачаць**?
З таго, што яна нам сказала, Тод...
...сядзець цішэй вады, усё ўладкаваць, а потым зноў сабраць нашу **каманду**.


ПРАЙШЛО ШЭСЦЬ ТЫДНЯЎ:
Мардабой.
Усёбачнае вока.
Вы ўпэўненыя, што гатовы да гэтага?
Канешне. Забівашка - **жывы прыклад** супергероя ў рэальным жыцці. Вызваліць яе з турмы будзе для нас **велізарным гонарам**.
Вы азнаёміліся з **планам першага паверха** турмы?
Мы з хлопцамі вывучылі яго **на памяць**, Мардабой. Калі спытаеш, мы зможам знайсці яе камеру з **заплюшчанымі вачамі**.
Як толькі ты са мной скантактаваўся, я пачаў рабіць па сто прысяданняў **у дзень**. Сёння мы **дакладна** не абсяромся.
Выдатна.


Усе ўзялі з сабой **кантактныя карты**, так? Дзверы ў гэтай турме максімальна ахоўваюцца, але з дапамогай гэтых **спецыяльных карт**, якія яна зрабіла, можна вырубіць любую **сістэму**.
Яны нам спатрэбяцца, каб **патрапіць унутр**, але што важней, яны нам дапамогуць **выйсці вонкі**.
Зразумела.
Тод, ты здабыў **дымавыя шашкі**?
Месяцовая пташка, ты памятаеш пра **сігналы трывогі**?
Яны тут.
Пры мне столькі несмяротнай зброі, што табе нават і **не снілася**, Мардабой.
Добра. Калі ўсё пойдзе згодна плану, мы зноў збярэмся тут праз **чатырнаццаць хвілін**.
Адвечная справядлівасць, чувак.
Адвечная справядлівасць, браток.
А цяпер пойдзем вернем нашу **Забівашку**.


Уаў! У рэальным жыцці яна выглядае **даволі пужліва**. Ды і вароты здаюцца большымі, чым на **малюнках**.
Спакойна, прыяцель. Усё будзе нармальна.
Божа, не магу паверыць, што я **не сказаў** вам гэта, рабяты, але мне ўчора прысніўся дзіўны сон, у якім нас **арыштавалі тут** і мы самі аказаліся **ў турме**.
Чалавека-казурку нават, здаецца, забілі, але гэта мог быць **Тод**. Я **не памятаю**.
Што?
Марці, можа **запхнешся**?
Чувак, я ж не кажу, што ўсё **так і будзе**. Проста я ўзгадаў аб гэтым, калі мы тут **сабраліся**.
Чорт, я **не магу**.
Што?
Прабачце. Я **думаў**, што змагу, але не. Відаць, я **ўпаў у паніку** ці штосьці такое.
Павінен прызнацца, я і сам трохі **нервуюся**. Мабыць, нам варта...
Хэй! Якога чорта тут **адбываец-ца**?


Чорт! Усе назад да машыны!
Курвіска!
Ды кінь ты, чувак! Зробіш яшчэ адну!
Штосьці здарылася?
Не, проста парачка мудазвонаў.
О божа. Лічыш, ён нас **запомніў**? Лічыш, ён пазнаў нашыя касцюмы?
Хто ведае, але бліжэй да гэтай турмы я набліжацца не стану. Вы бачылі рост гэтага чувака?


Што наконт **Забівашкі**? Як мы цяпер ёй **дапаможам**?
Я ня ведаю. Думаю, проста працягнем **трэніравацца**.
Ага, мы ўсе будзем трэніравацца і вернемся сюды, валодаючы **большым досведам**.
Можна між іншым **аддаваць ёй належнае**. Ну, бароцца са злачыннасцю **ў яе гонар** ці назваць у яе гонар **штаб-кватэру**?
Так, мне гэта **падабаецца**. Лічу, гэта будзе **шмат значыць** для яе, док. Гэта будзе пасыл, што мы **пра яе не забылі**.
Дакладна.
А цяпер давайце звалім адсюль, пакуль той здаравяка не прыйшоў **за намі**.
Купка абдзёраных **курыц**.
Вы павінны разумець, што мы **не спужаліся**. Проста мы павінны былі быць упэўненыя, што **дасканала падрыхтаваліся**.
Канешне, прайшло шэсць месяцаў і мы яе так і не вызвалілі, але выратаванне Забівашкі знаходзіцца на вяршыні нашага **спіса неабходных спраў**.


Гэта я стаю на магіле сваіх любімых бацькоў. Мая маць загінула з-за крывазліцця ў мазгу, але бацька сапраўды быў забіт пераапранутымі ў касцюмы **злодзеямі**.
Я не магу паверыць, што думаў аб тым, каб усё гэта кінуць. Знаходзячыся тут і гледзячы на іх магілы я разумею, што насіць маску па панядзелках, чацвяргах і кожную другую нядзелю - мой **лёс**.
Яшчэ больш крута, калі ты стаіш у доўгім паліто. На мінулым тыдні я спрабаваў так з **джынсамі**, але выглядала гэта **непрыстойна штодзённа**.
Чувак, ты выглядаеш **шыкоўна**. Як малады Брус Уэйн, які абяцае адпомсціць **Джо Чылу**.
Я і адчуваю сябе маладым Брусам Уэйнам...
...гэта дзіўна, але чым дольш я тут стаю і гляджу на іх магілы, тым больш я хачу апрануць касцюм і зрабіць штосьці **годнае**.
Ты нават не ўяўляеш, як я табе **зайздрошчу**, чувак. Не зразумей мяне няправільна, але часам я хачу, каб **маіх** бацькоў забілі.
У любым выпадку яны жывы яшчэ толькі таму, што недастаткова мяне навучалі.
Я магу пазычыць у цябе паліто і зрабіць пару здымкаў на **магіле маёй бабулі**?
Я ведаю, яе не **забівалі** і ўсё такое, але яе прыступы ангіны гэта адзінае, што магло б адбіцца **асабіста на мне**.
Канешне. Дай мне яшчэ пару хвілін...
...я хачу зрабіць пару здымкаў, дзе я сяджу на каленах з пахіленай галавой, як на вокладцы «**Бэтмэна**». Ну як - файна выглядае?
Чувак, ты выглядаеш проста **шыкоўна**.



Школа закончылася так жа тухла, як і пачалася, і я не вельмі шмат **вывучыў** за гэты час.
Марці аказаўся цікім **геніем** і сваліў у Гарвард, каб мільён гадоў вывучаць медыцыну, але мы з Тодам не вельмі хацелі ісці ў каледж.
Мы думалі пайсці на курсы па **рэльефнай архітэктуры**, але вырашылі спачатку трохі падзарабіць, таму ўладкаваліся ў толькі што адчынены **фаст-фуд рэстаран**.
Знялі кватэру ў Хабокене, якая аказалася далей, чым мы хацелі, але была адзінай, якую мы **сапраўды** маглі сабе дазволіць.
BIG B
Але было файна мець сваё ўласнае жыллё і мы па выхадных мелі дадатковую працу ў краме коміксаў...
Вы заўважалі, колькі герояў баевікоў завуць **Джон** ці **Джэк**? Джон Макклейн, Джон Рэмба, Джон Матрыкс, Джон Конар...
...капітан Джэк, Джэк Рычэр, Джэк Слэйтэр і Джэк Тэйкен.
Што яшчэ за **Джэк Тэйкен**?
DIAMOND
Джэк Taken з Taken, ідыёт. Персанаж Ліама Нісана.
«Taken» - гэта назва **фільма**, кавалак лайна. Называецца Taken, бо там арабы выкралі **Шэнан** з **«Лоста»**!
Вы, напэўна, лічыце, што пасля ўсяго, праз што я прайшоў, я вырашыў уйсці **як мага далей** ад свету коміксаў...




У рэшце рэшт, калі б не мой **супергеройскі фетыш**, майго бацьку не забілі б, а на Кейці **не накінуліся** б.
Адзіная прычына, па якой я **пазбег турмы**, была ў тым, што бацька сказаў копам, што гэта ён быў **Мардабоем**. Гэта быў яго апошні развітальны падарунак.
І што ж прымушае мяне рабіць гэта? Чаму я ўсё яшчэ хажу на працу, апрануўшы зялёна-жоўты касцюм пад адзежу?
Ну, у першую чаргу, каб дапамагаць людзям...
...Але калі быць шчырым з самім сабой... Думаю, я проста занадта моцна аблажаўся ў ролі Дэйва Лізеўскі, маё рэальнае жыццё пайшло кату пад хвост...
...Таму зараз Мардабой мне патрэбны **больш, чым калі-небудзь**.
ABBOT'S
Tillio's
Гатовы, цудахлопчык?
Tillio's
DISC RECORD
Я з табой, Бэтмэн.


Так, усе адыйдзіце назад. Дайце мне **трохі прасторы**. Васьмёрку ў кут ці я асабіста ўстану на калены і **адсмакчу ў цябе**, Фрэнкі.
Гульня не скончана, пакуль яна не завершана, мой сябар. Бей ужо, чорт бяры.
Хэй!
Чаму вырубілі **святло**?
А ты **не стары** ўжо, каб баяцца цемры, вырадак?
Вось лайно.
Я расследваю серыю **крадзяжоў з уломам** у гэтым раёне. Вы ведаеце, хто я і што магу зрабіць.
Так што кажыце, хто адказны за гэта, і тады вернецеся дадому з зубамі ў роце.
Джудзі! Скажы гэтаму прытырку злезці са стала! З-за яго ўсе шары зноў **зблыталіся**.


Хэй! Я ж, здаецца, ужо казала вам, ідыётам, больш не песціцца з **электрашчыткамі**. Пасля кожнай вашай хрэні з «**выключаным святлом**» мне прыходзіцца абнуляць лічыльнікі.
Прабач.
Хто-небудзь ведае, аб **чым** ён тут кажа? Калі так, тады скажыце, а то ён ніколі **не знікне**.
Канешне, **я ведаю**. Гэта Тай Уіз, жыве ва Усходняй часці горада на 136-й вуліцы. Дом 822, кватэра 4F. Скажы яму, што **Масква** перадае прывітанне.
Якога **чорта**?
Ды гак з ім, чувак. Кот павінны мне грошы. Я хоць парагачу, калі пабачу, што яго арыштаваў **жабяня Кэрміт**.
Дзякуй вам, сэр. Вельмі ўдзячны. Тваралом, святло.
Прыняў.
Курвіска!
Не палохайся. Зараз усё ўключыцца...
Божа, я рэальна **ненавіджу** гэтых дзяцей...



Я мог бы ўвайсці праз дзверы, але хацеў упэўніцца, што Тай Уіз не паспрабуе ўцякчы праз вакно. Ну і плюс - спускацца ўздоўж сцяны будынка ў пяцьдзесят разоў файней.
Але я не чакаў, што ўнізе будзе столькі людзей. Спадзяюся ён не пачуе, як яны крычаць, і не падыйдзе да вакна, каб паглядзець, у чым справа.
Ты ўпэўнены, што ён сказаў 4F?
Дакладна. Як **Фантастычная чацвёрка**, таму я і запомніў.
Добра, цяпер нам трэба зрабіць гэта адначасова. Калі мы ўварвемся да яго з дзвюх накірункаў, ён абавязкова **абсерыцца**, і мы схопім яго за **секунду**.
А што, калі я не змагу выбіць дзверы з першай спробы? Відаць, што яны даволі **трывалыя**.
Усё будзе ў парадку. Проста пераканайся, што б'еш менавіта туды, куды я табе **паказваў**, і ўсё будзе **файна**.
Так... Ты гатовы? На лічбу **тры**...


Курвіска!
Уаў. Ты ў парадку, чэл?
Усё ў норме. Будзь напагатове. Мы павінны праверыць, што ён нідзе не схаваўся.
Ты ўпэўнены, што мы ў той кватэры?
Чувак, у каго, як не ў рабаўніка, будзе дома 4 **blu-ray плэера**? Не адцягвай увагу і будзь гатовы прыкрыць мяне, калі ён адкуль-небудзь выскачыць...



Чорт.
Ён жывы?
Ды ўсё з ім добра. Проста ўпораты. Зараз перавярну яго і завяжу яму рукі за спінай... Каб быць упэўненым, што ён не захлынецца ва ўласных ванітах.
Што за візітоўкі?
Я падумаў, мы маглі б іх пакідаць, як рабіў Чалавек-павук у першых нумарах. Гэта выглядае моцна і дае людзям зразумець, што **супергероі** ім дапамагаюць...
З НАЙЛЕПШЫМІ ПАЖАДАННЯМІ, ВАШЫЯ ПРЫЯЗНЫЯ СУСЕДЗІ СУПЕРГЯРОІ
Ты памыліўся ў слове «Супергерoі»
Сапраўды?
Добра, паімчаліся. Нам трэба знікнуць адсюль і паведаміць копам, дзе яго **шукаць**!
Чорт...



Мы вярнуліся на базу, згрызаючы пазнокці. Прайшло ўжо сем тыдняў з тых часоў, як мы апошні раз кагосьці арыштоўвалі. Плюс мяне выводзіў з сябе новы герой па мянушцы **Сокавыціскалка**...
Я ўсё яшчэ лічу, што ты робіш з мухі слана, Мардабой.
Ой, ды суняміся, чувак. Гэта была прыватная штаб-кватэра Забівашкі. Ты ня можаш выкарыстоўваць яе як уласнае жыллё.
Уся падлога і так заваляна дыскамі і лайном, а цяпер яшчэ тут валяецца твая **бялізна**. Ты сюды на **сталы** пераехаў, ці як?
Толькі да тых часоў, пакуль зноў не ўзнімуся на ногі, чувак. Я трохі ўлез у даўгі, а тут я магу сэканоміць якія-ніякія грошы.
Шкада, што я не такая важная асоба, як Брус Уэйн, але ўсім жа быць у рэальным жыцці **багатымі плэйбоямі**.
Паслухай, мы не кажам, што ты не можаш тут заставацца, але табе трэба пачаць паважаць гэтае месца. Ты ня можаш цэлы дзень проста ляжаць і гуляць у відэагульні.
Чаму не? Усё роўна нічога не адбываецца. Гэта завaруха са суперзлодзеямі скончылася так жа хутка, як і пачалася. Іншыя героі нават на **зборы** не прыходзяць.


Мы заўсёды будзем гатовыя на выпадак, калі камусьці спатрэбімся, але пакуль гэтага няма, мы засяроджваемся на **трэніроўках**.
І што ж ты, курвіска, трэніруеш? Піўное пуза?
Забівашка б ашалела, калі б убачыла, як вы спаганілі сакрэтную штаб-кватэру яе бацькі. На шчасце для вас зараз яна замкнута ў **адзіночнай камеры**.
Што за **лайно**?
HIT-GIRL
Вы пэўна жартуеце?


Прывітане, каханы. Дапамажы мне з торбамі! Я ўзяла табе поўны зборнік Мсціўцаў, які ты хацеў. Цяпер мы можа правесці марафон фільмаў Marvel, калі твае сябры ня супраць.
Эм, Мардабой, гэта мая дзяўчына **Клэр**. Клэр - гэта Мардабой.
Ты ж сказаў, што ў цябе няма грошаў.
Гэта ж фільмы Marvel, чувак. Іх можна лічыць навучалымі дакументалкамі, таму я трохі на іх ахвяраваў. Канешне, калі хочаш з-за гэтага паводзіць сябе як **казёл**...
Так, з мяне **досыць**. Нам трэба ўсе **пераацаніць** і прыняць рашэнне, што чакае нашу **каманду** ў будучыні. Бачыце гэты надпіс на сцяне?
EVIL PREVAILS WHEN GOOD MEN DO NOTHING!
JUSTICE FOREVER
«Зло святкуе, калі добрыя хлопцы нічога ня робяць»? Дык вось, вы, хлопцы, **нічога ня робіце**, і мяне ад гэтага **ванітуе**.
Мы павінны зноў заняцца сапраўднай **барацьбой са злачыннасцю**. Нам патрэбна якая-небудзь сур'ёзная аперацыя.
Я склікаю збор. Ён адбудзецца заўтра ўвечары. Хто не прыйдзе - аўтаматычна будзе **выключаны** з каманды. Усім **зразумела**?
Яшчэ як, містар капрызуля.
DRINK BELGIUM HEARTY PALE ALE
OLD FAITHFUL



Калі мы вярнуліся дадому, я пачаў падрыхтоўку бутэрбродаў з арахісавым маслам для начнога дзяжурства, а Тод спрабаваў пазнаёміцца з жанчынай на нейкім сайце знаёмстваў для дарослых, які ён нядаўна знайшоў.
Ён прасіў мяне схадзіць з ім на якое-небудзь падвойнае спатканне, але я сказаў яму, што мне гэта не **падабаецца**.
Што дрэннага ў тым, каб злучыць сваё жыццё з двума на ўсё згоднымі дарослымі дамамі, Дэйв? Адносіны з дзяўчынамі нашага ўзросту нікуды не прывядуць. Але калі дадаць ім пару дзясяткаў гадоў, мы для іх будзем ужо гробанымі **Тоні Старкамі.**
Хрэн яго ведае. Выбіраць дзяўчын толькі на падставе іх узроста - неяк ненармалёва. Гэта ўжо **педафілія** нейкая.
Чувак, якая да чорта **педафілія**? Ды палове гэтых дам за **пяцьдзесят**.
Я маю на ўвазе, што мы яшчэ **дзеці**, прытырак.
Я проста лічу, што супергероі павінны гуляць па правілах і жыць згодна **высокім маральным прынцыпам**.
Значыць, спачатку ты адмовіўся клосціцца з **фанаткамі**, а зараз яшчэ і з **мамкамі**. Я не люблю аб гэтым казаць, але ты **дзіўны**.
У якой гадзіне будзеш дома?
NEVER FORGET
Мяркую, прыкладна ў тры. Хачу пабадзяцца пару гадзін, упэўніцца, што ўсё **нармальна**.



Будзь **асцярожны**, Пітар Паркер.
Я заўсёды асцярожны, цётухна Мэй.
♫
NO PARKING ANY TIME
Лайно.
Я, здаецца, забыў выключыць прас.
123


Чалесам табе па вуснах, а не прас.
TO BE CONTINUED






ЗОРНЫЯ ВОЙНЫ. ДАРТ ВЭЙДЭР

(MARVEL, 2015)

ужо даступны на www.patreon.com/comicsby

Gillen, Larroca, Delgado. Дзеянне адбываецца пасля падзей «Зорных войн: Эпізод IV: Новая надзея» і першых трох выпускаў комікса «Зорныя войны». Дарт Вэйдэр павінен пакутаваць ад наступстваў яго няздольнасці спыніць Альянс паўстанцаў падчас бітвы пры Явіне, і адпраўляецца на місію, каб весці перамовы з Джаба Хатам . Тым часам Вэйдэр наймае двух паляўнічых за галовамі, каб схапіць Люка Скайуокера і таямнічага агента Імператара.







ПАДТРЫМАЙ МЯНЕ НА PATREON

www.patreon.com/comicsby

Твая падтрымка дапаможа мне праводзіць больш часу за перакладамі коміксаў, каб у цябе было яшчэ больш літаратуры на беларускай мове.

Выбяры адзін з варыянтаў падтрымкі на patreon:

Афіцыйны патрон

3 $
ЗА МЕСЯЦ

ДАЛУЧЫЦЦА

Афіцыйны патрон атрымлівае спасылку на рэліз пераклада **на 1 месяц раней**, чым падпісчыкі ў сацыяльных сетках.

- На 1 месяц раней, чым усе

Патрон з падпіскай прэміўм

5 $
ЗА МЕСЯЦ

ДАЛУЧЫЦЦА

Патрон з падпіскай прэміўм атрымлівае спасылку на рэліз новых серый **на 1 год раней**, чым падпісчыкі сацыяльных сетак.

Сярод такіх новых серый мы плануем коміксы «Цуда-жанчына», «Дарт Вэйдэр», «Чорны молат», «Дэпартамент праўды» і інш. Спачатку - па 2 выпускі ў месяц, а далей - у залежнасці ад колькасці патронаў з падпіскай прэміўм.

Так сама атрымлівае ўсё тое, што і **Афіцыйныя патроны**.

- На 1 год раней, чым усе
- На 1 месяц раней, чым усе
- Дотык да новых серый коміксаў

Мае мэты:

100 патронаў -
я найму перакладчыкаў, каб было яшчэ больш перакладаў на беларускую мову.

500 патронаў -
я ствару выдавецтва, мэтай якога будзе - электронная публікацыя арыгінальных коміксаў і кніжак на беларускай мове.

1000 патронаў -
выдавецтва пачне друкаваць папяровыя кніжкі і коміксы з творамі на беларускай мове, якія можна будзе набыць у беларускіх крамах.